**Л.А.Дзямешка,** *кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# НАВУКОВЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА АРГАНІЗАЦЫІ СЯМЕЙНАГА ЧЫТАННЯ Ў БІБЛІЯТЭЦЫ

Сучасная цывілізацыя дасягнула той ступені развіцця, калі далейшы яе рух уперад стаў цалкам залежыць ад праблемы ўдасканалення чалавека.

Як вядома, развіццё і станаўленне асобы пачынаецца з дзяцінства, і ў гэтым сэнсе вялікую ролю выконваюць сям'я і сямейнае чытанне. У "Бібліятэчнай энцыклапедыі" тэрмін "сямейнае чытанне" вызначаецца як "чытанне кнігі ўслых членамі сям'і і дзецьмі ці дзецьмі ў дамашніх умовах" [1, с. 946]. Больш змястоўнае азначэнне дае Н.А.Голубева. Яна прапануе разглядаць сямейнае чытанне як творчую чытацкую дзейнасць дарослых і дзяцей ва ўмовах суб'ектных зносін, накіраваных на развіццё асобы дзіцяці, на ўдасканаленне педагагічнай, у тым ліку псіхалагічнай і метадычнай адукаванасці бацькоў [2]. З гэтага азначэння вынікае, што дзіця як чытач з'яўляецца аб'ектам уздзеяння з боку бацькоў, але пры гэтым не перастае быць раўнапраўным суб'ектам сямейнага чытання. Прысутнасць такіх сувязей адлюстроўвае размеркаванне сумеснай дзейнасці, а таксама сведчыць, што дзіця-чытач з'яўляецца аб'ектам педагагічнага ўздзеяння. Чытацкія зносіны, такім чынам, маюць яскравы педагагічны характар.

Канцэпцыя педагогікі сатворчасці, прапанаваная расійскім навукоўцам Т.Д.Полазавай, дазваляе вызначыць шляхі найбольш поўнай рэалізацыі ў рабоце з бацькамі і іх дзецьмі спецыфічных магчымасцей бібліятэкі, выявіць метады і формы падрыхтоўкі бацькоў да сямейнага чытання, да творчых стасункаў дзяцей і дарослых. У цэнтры ўвагі аўтара – кіраванне чытаннем дзяцей [3]. Распрацаваныя псіхолага-педагагічныя прынцыпы гуманізацыі гэтага працэсу, на наш погляд, з'яўляюцца зыходным пунктам арганізацыі сямейнага чытання. Маючы на ўвазе канцэптуальныя палажэнні педагогікі сатворчасці, можна вызначыць асноўныя задачы і кірункі дзейнасці бібліятэк, сярод якіх:

– раскрыццё інфармацыйна-бібліятэчных рэсурсаў, накіраваных на фарміраванне асобы;

– рэкламаванне дакументаў з мэтай павышэння педагагічнай кампетэнтнасці бацькоў, культуры сямейных стасункаў;

БІБЛІЯТЭКА БДУКІ

– арганізацыя вольнага часу сям’і ў бібліятэцы, стварэнне прыцягальных умоў для кансалідацыі сям’і;

– выкарыстанне ў спалучэнні традыцыйных і інавацыйных тэхналогій абслугоўвання бацькоў і дзяцей педагагічнай і дзіцячай літаратурай;

– укараненне новаўвядзенняў па выхаванні інфармацыйнай культуры бацькоў і дзяцей.

Сямейнае чытанне неабходна разглядаць у адзінстве дзейнаснага і асобаснага аспектаў. Такі падыход уяўляецца перспектыўным пры вывучэнні сямейнага чытання ў структуры бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэк.

Асаблівае значэнне набывае падрыхтаванасць бацькоў да чытацкіх зносін з дзіцем, што непасрэдна залежыць ад ступені іх патрэбнасці ў педагагічнай і дзіцячай літаратуры. Актывізаваць такую патрэбнасць здольная рэкамендацыйная бібліяграфія, для якой характэрна магчымасць арыентаваць чытачоў сярод імклівага патоку інфармацыі. Сутнасць рэкамендацыйнай бібліяграфіі як дапаможніка ў арганізацыі сямейнага чытання растлумачвае палажэнне аб яе ролі ў павышэнні педагагічнай, эстэтычнай культуры кіраўнікоў чытання [4]. На жаль, у навуковай, метадычнай, вучэбнай літаратуры і на практыцы пытанню падрыхтоўкі бацькоў да чытацкіх зносін з дзіцем на падставе рэкамендацыйна-бібліяграфічных выданняў не звяртаецца патрэбнай увагі. Гэта часта прыводзіць да адсутнасці ў бацькоў інфармацыйных патрэбнасцей у педагагічнай і дзіцячай літаратуры, абыякавых адносін да бібліяграфічных выданняў наогул. Мы лічым неабходным разглядаць такія выданні ва ўзаемасувязі і ўзаема-залежнасці з арганізацыяй сямейнага чытання бібліятэкай.

Распрацоўка рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў для бацькоў патрабуе наяўнасці ў іх змесце пэўнай устаноўкі на ўспрыманне кнігі кіраўніком дзіцячага чытання, на сумесныя чытацкія зносіны з дзіцем, а значыць і на магчымасць уплыву на маральна-эстэтычнае развіццё дзіцяці ў працэсе чытацкіх зносін. Перспектыўным з’яўляецца распрацоўка такіх рэкамендацыйна-бібліяграфічных выданняў, у якіх арганічна рэалізуюцца функцыі сямейнага чытання: маральна-выхаваўчая, эмацыянальна-эстэтычная, кампенсаторна-забаўляльная і вырашаюцца задачы арганізацыі цеснага творчага супрацоўніцтва бацькоў і дзяцей, павышэння ўзроўню інфармацыйнай і чытацкай культуры, фарміравання чы-

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

тацкіх інтарэсаў, задавальнення інфармацыйных патрэбнасцей бацькоў як кіраўнікоў сямейнага чытання.

У такім выпадку магчыма прадбачыць пэўныя вынікі цэласнага інфармацыйнага ўздзеяння бібліяграфічных дапаможнікаў на кіраўнікоў дзіцячага чытання – бацькоў. Дапаможнікі пашыраюць і паглыбляюць веды бацькоў у галіне педагогікі, дзіцячай літаратуры; дапамагаюць бацькам зразумець сутнасць літаратуры, мастацтва ў духоўна-эстэтычным развіцці асобы дзіцяці; важнасць ролі сямейнага чытання – чытацкіх зносін бацькоў і дзяцей, ролю чытання ў духоўна-эстэтычным развіцці асобы дзіцяці. Пры гэтым матывацыйна-асобасная функцыя рэкамендацыйнага бібліяграфічнага выдання павінна быць галоўнай. У такім разе ўсе іншыя функцыі будуць выступаць у якасці дапаможных пры арганізацыі сямейнага чытання.

Для дзяцей як раўнапраўных членаў сямейнага чытання важна стварыць пэўнае асяроддзе, мэтанакіравана і сістэмна арганізоўваць іх чытанне. Дарэчы, у Беларусі існуе гістарычная традыцыя сямейных чытанняў. Так, Таварыства Полацкай гарадской бібліятэкі, створанае ў 1912 г., на працягу многіх гадоў арганізуе сямейныя вечарыны, на якіх услых чытаюцца і абмяркоўваюцца кнігі вядомай беларускай пісьменніцы Цёткі “Лемантар”, “Першыя чытанні для дзетак беларусаў”, “Гасцінец для малых дзяцей”; паэма-казка М.Багдановіча “Мушка-зелянушка і камарык-насаты тварык”, хрэстаматыя Я.Коласа “Другое чытанне для дзяцей беларусаў”. Мэтамі такіх сямейных чытанняў з’яўляюцца адукацыя дарослых і дзяцей, выхаванне высокіх грамадскіх і эстэтычных ідэалаў. Да таго ж шырока выкарыстоўваюцца метадычныя напрацоўкі перадавых педагогаў і асветнікаў Беларусі Д.А.Сцяпуры, К.І.Ціхамірава, Ф.А.Кудрынскага, Е.Р.Раманава [5, с. 62].

На сучасным этапе на базе публічных бібліятэк атрымліваюць развіццё бібліятэкі сямейнага чытання [6]. Так, пастулова напрацоўваюць вопыт арганізацыі сямейнага чытання дзіцячая бібліятэка-філіял № 14 цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк г. Мінска, бібліятэка-філіял № 5 Светлагорскай раённай цэнтралізаванай сістэмы, гарадская бібліятэка-філіял № 4 Маладзечанскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы, Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка і інш.

Сярод шырокага спектра дзейнасці бібліятэк па арганізацыі сямейнага чытання важнае месца займаюць:

– кансультацыйная работа з бацькамі;

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

– дыялогавыя формы па рэкамендацыі літаратуры для чытання, арганізацыі гутарак па прачытаных творах;

– наглядныя формы інфармавання (выставы твораў для чытання ўсёй сям'ёй, стэнды інфармацыі, бібліятэчныя плакаты). Шырока распаўсюджаны вечарыны, агеньчыкі, конкурсна-гульнёвыя сямейныя зборы пад дэвізам "Мама, тата, я – чытацкая сям'я", "Любімыя кнігі нашага радаводу" і інш. Звяртаецца ўвага на сямейнае планавае чытанне. Для яго арганізацыі за адсутнасцю рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў бібліятэкары распрацоўваюць тыпавыя і індывідуальныя планы чытання, спісы літаратуры для дзяцей і бацькоў з метадычнымі рэкамендацыямі па іх выкарыстанні ва ўмовах сям'і, прапануюць розныя "малыя формы" бібліяграфіі. Сутнасць іх – у прыцягненні сямей да чытання літаратуры з улікам дзіцячага ўзросту, інтарэсаў дзяцей, падрыхтаванасці бацькоў.

Вялікая роля бібліятэк у арганізацыі сямейнага чытання садзейнічае маральнаму і інтэлектуальнаму збліжэнню членаў сям'і, што ў выніку ўплывае на духоўны стан нашага грамадства.

___________

1. *Библиотечная* энциклопедия. – М.: Пашков дом, 2007. – 1295 с.

2. *Голубева, Н.Л.* Средство организации семейного чтения / Н.Л.Голубева // Библиография. – 2001. – № 4. – С. 46–49.

3. *Полозова, Т.Д.* Педагогика сотворчества / Т.Д. Полозова // Библиография. – 1993. – № 10. – С. 15–20.

4. *Дулатова, А.Н.* Аннотирование детской художественной литературы: учеб.-метод. пособие / А.Н.Дулатова. – М.: Либерия, 2004. – 80 с.; *Новичкова, Н.Ф.* Еще раз о системе пособий для детей и подростков / Н.Ф.Новичкова // Сов. библиография. – 1986. – № 5. – С. 15–23.; *Корчинская, И.* Чтение детей: проблемы сотрудничества семьи и библиотеки / И.Корчинская // Библиография. – 1995. – № 3. – С. 14–17.

5. *Дзямешка, Л.А.* Асветніцкая і адукацыйная місія публічных бібліятэк Беларусі / Л.А.Дзямешка // Адукацыя і выхаванне. – 2008. – № 9. – С. 60–67.

6. *Пласцініна, Г.* Бібліятэка для ўсёй сям'і / Г.Пласцініна // Бібліятэчны свет. – 2003. – № 1. – С. 16.; *Лукзен, Л.* Читателя растим в семье: советы родителям / Л.Лукзен // Бібліятэка прапануе. – 2008. – № 5. – С. 19–21.; *Свірын, Г.* Сямейная ўтульнасць бібліятэкі для сем'яў / Г.Свірын // Культура. – 2008. – 30 жніўня. –

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

С. 3.; *Богданова, А.* С семьёй и для семьи / А.Богданова // Библиотека. – 1995. – № 5. – С. 58–60.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ